ЖНІВЕНЬ У СТАЛІЦЫ АЛЬМАНСКІХ БАЛОТ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Вёску Альманы называюць краем зямлі беларускай, бо з паселішча вядзе толькі адна дарога ў знешні свет: з паўднёва-ўсходняга боку падыходзіць памежная зона з Украінай, а з паўночнага ўсходу і ўсходу — бяскрайнія балоты. Балотны біятоп з'яўляўся неад'емнай часткай жыцця вяскоўцаў, надзейным сродкам выжывання палешукоў ва ўсе часы. Сёння таксама. За чарніцы ў гэтым годзе давалі даволі вялікія грошы — чатыры пяцьдзясят за кіло. Як толькі пайшлі першыя ягады, дарослае насельніцтва па традыцыі падалося ў лясы сярод балот. У жніўні — невялікая перадышка перад іншым ягадным бумам: журавіны яшчэ не паспелі. Больш спрытныя збіральнікі ў гэты час ходзяць па балоце, выглядваюць самыя ўраджайныя мясціны, плаваюць нават за Засамінае возера. Журавіны для альманцаў — сапраўдны кландайк. Таму ў светлы час сутак у вёсцы можна ўбачыць толькі пенсіянераў і дзяцей — як мясцовых, так і прыезджых.

Некалі меліяратары адваявалі ў балота вялікую плошчу і за Альманамі ва ўрочышчы Гачы з'явілася шчодрае хлебнае поле. На гэтым жніве працаваў і кіроўца МАЗа Рыгор Аглашэвіч — адзін з найлепшых кіроўцаў КСУП «Струга», якога я «заспеў» у кузаве з намалочаным трыцікале. На полі сустрэў галоўнага агранома гаспадаркі Марыю Завялаву з яе двайнятамі *(на фота)*. Сынок Саша і дачушка Ксенія так хацелі ўбачыць матулю, што прыбеглі за ваколіцу на «маміна» поле.

Цяпер у вёсцы пражывае 150 сем'яў, у якіх гадуюцца 287 дзяцей. За апошні год у сталіцы Альманскіх балот нарадзілася 7 дзяцей. А ў 1971 годзе ў Альманах з'явіліся на свет семдзесят (!!!) немаўлят. Але гэта быў пік нараджальнасці... У няспешнай экскурсіі па альманскіх вуліцах гэтым разам мне сустрэліся людзі з пазітыўнымі і настраёвымі тварамі.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.
Столінскі раён.

Больш здымкаў глядзіце на сайце www.zviazda.by.

■ Скарбы малой радзімы

ЭКСПАНАТЫ АД ДАРАГАНАЎ

Гэты род шмат чаго зрабіў для Асіповіцкай зямлі. Дзякуючы Восіпу і Мацвею Дараганам у канцы XIX стагоддзя тут была пабудавана ўнікальная чыгуначная ветка ад Асіповіч да Старых Дарог, вопыт пабудовы якой потым распаўсюдзілі па ўсёй Расійскай імперыі.

Акрамя гэтага тут з'явіліся дзве станцыі, масты і шмат чаго сучаснага на той перыяд, што зрабіла Дараганава вельмі перспектыўнай вёскай. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі гэты род пераехаў за мяжу і сувязь надоўга абарвалася. Некалькі гадоў таму яна была адноўлена, і ў раён прыехаў са Швецыі праўнук Восіпа Дарагана Андрэй разам са сваёй жонкай Ланай. Дзякуючы ім, раённы музей атрымаў багатую калекцыю прадметаў і дакументаў славутага роду. Для іх размяшчэння былі выдзелены пяць залаў у шматпрофільным маладзёжна-падлетковым цэнтры «Равеснік». Нядаўна сужэнцы зноў наведалі раён, у выніку чаго калекцыя музея папоўнілася яшчэ больш чым сотняй новых экспанатаў, а Свята-Панцеляймонаўская царква ў вёсцы Дараганава — фамільнымі абразамі сямейства.

— Гэта была па-сапраўднаму цёплая сустрэча, — адзначыла **дырэктар раённага гісторыка-краязнаўчага музея Антаніна СЦЯПАНАВА.** — Прыязджалі таксама бацькі Ланы Дараган, якія жывуць у Таліне, госці з музея флоту Санкт-Пецярбурга. Частку экспанатаў Андрэй у свой час перадаў і туды. Зараз ён з жонкай прывёз шмат дакументаў і сямейных фота, некаторыя прадметы быту, жаночыя аксесуары. У гонар гэтай сустрэчы ў залах экспазіцыі роду Дараганаў адбыўся святочны баль. Андрэй прызнаўся, што адчувае сябе на радзіме продкаў як дома. І гатовы сюды вяртацца яшчэ не раз.

Раён арганізаваў для Андрэя і Ланы экскурсію па мясцінах, звязаных з жыццём і дзейнасцю Дараганаў. Яны наведалі храм і святую крыніцу ў Прошчы, школьны музей у аграгарадку Дараганава, вёску Крынка, дзе раней знаходзіўся маёнтак Восіпа Дарагана. Але асабліва сужэнцы радаваліся сустрэчы з тымі людзьмі, якія за гады знаёмства сталі ім амаль роднымі. Шмат чаго для вяртання гістарычных каштоўнасцяў на радзіму зрабіла былая дырэктар школьнай музея ў Дараганаве Жанна Караленя. Гэта менавіта дзякуючы ёй была адноўлена сувязь з нашчадкамі знакамітага роду і завязалася доўгатэрміновае плённае супрацоўніцтва. Андрэй і Лана вельмі цёпла адносіліся да Жанны Сямёнаўны. На жаль, гэтым разам сустрэцца ў яе з гасцямі не атрымалася. Вясной таленавітай настаўніцы і шчырай жыццялюбкі не стала — яна заўчасна пайшла з жыцця пасля працяглай хваробы.

Нэлі ЗІГУЛЯ